# КРАМЯНЁВЫЯ ВЫРАБЫ ПАЎНОЧНАБЕЛАРУСКАЙ КУЛЬТУРЫ Ў МАТЭРЫЯЛАХ РАСКОПАК 2000 – 2007 ГАДОЎ: ПЕРШЫЯ ВЫНІКІ ДАСЛЕДАВАННЯ

***канд. гіст. навук Макс.М. ЧАРНЯЎСКІ***
***(Інстытут гісторыі НАН Беларусі, Мінск)***

*Аналізіруюцца крамянёвыя вырабы з паселішча паўночнабеларускай культуры Асавец 7 (Бешанковіцкі раён Віцебскай вобласці), атрыманай у выніку даследаванняў 2000 – 2007 гадоў. Падаецца агульная характарыстыка матэрыялу, яго асаблівасці, праводзіцца марфалагічная класіфікацыя калекцыі. Робяцца высновы аб высокай ступені выкарыстання сыравіны (аж да паўторнага выкарыстання зламаных прыладаў), аб асаблівасці мясцовай крамянёвай індустрыі на фоне астатніх рэгіёнаў Беларусі перыяду позняга неаліту – бронзавага веку, аб перавазе ў калекцыі вырабаў паўночнабеларускай культуры прылад, змайстраваных у традыцыях лясного неаліту.*

Паўночнабеларуская культура існавала з канца трэцяй чвэрці 3 тыс. да н.э. да сярэдзіны 2 тыс. да н.э. Яна займала амаль усё Беларускае Паазер'е, паўднёва-усходнюю Латвію, частку паўночна-заходняй Расіі (паўночна-заходнюю Смаленшчыну і паўднёвую Пскоўшчыну) і, верагодна, невялікую частку паўднёва-усходняй Літвы. Дадзеная культура выклікае асаблівы інтарэс даследчыкаў тым, што існавала ў час актыўнага распаўсюджання ва Усходняй Еўропе культур шнуравога кола, суседнічала і ўзаемадзейнічала з некаторымі з іх, аднак з'яўлялася эвалюцыйным працягам неалітычных традыцый рэгіёна. Тэрыторыя, якую займала паўночнабеларуская культура, вядомая сваёй беднасцю на крэмень – асноўны матэрыял для майстравання прылад у каменным – бронзавым вяках Беларусі. Гэта сталася прычынай існавання багатай касцярэзнай традыцыі, вытокі якой знаходзяцца яшчэ ў мезаліце рэгіёна. Аднак у паўночнабеларускай культуры, у адрозненні ад папярэдніх, фіксуецца рэзкае павелічэнне колькасці крамянёвых вырабаў.

На сённяшні дзень вядома больш 20 помнікаў, на якіх сустракаюцца матэрыялы паўночна-беларускай культуры (мал. 1: 1) [1, с. 311, мал. 100; 2, с. 12 – 14]. Найбольш іх выяўлена на Крывінскім тарфяніку, на памежжы Бешанковіцкага і Сенненскага раёнаў Віцебскай вобласці. Сярод іх самымі даследаванымі з'яўляюцца паселішчы Крывіна 1 (раскапана больш за 525 кв. м) і Асавец 2 (больш 350 кв. м) [2, с. 6]. Выяўленыя на гэтых помніках матэрыялы складаюць да 90 % ад агульнай колькасці вядомых артэфактаў паўночнабеларускай культуры на тэрыторыі Беларусі. Тым не менш перад даследчыкамі паўстае праблема дакладнай культурнай ідэнтыфікацыі знойдзеных артэфактаў, у тым ліку і крамянёвых, бо амаль усе вышэйпералічаныя помнікі ўтрымліваюць таксама і матэрыялы папярэдняй, генетычна звязанай з ёй усвяцкай культуры. Распаўсюджванне знаходак гэтых дзвюх культур на Крывінскіх помніках паказвае, што вылучыць чыстыя стратыграфічныя гарызонты на ўжо даследаваных плошчах амаль немагчыма [2, с. 46, табл. 1]. Як вынік, дакладная культурная прыналежнасць большай часткі артэфактаў, за выключэннем керамічных, застаецца пад пытаннем. Да нядаўняга часу адзіным помнікам з чыстымі матэрыяламі паўночнабеларускай культуры было паселішча Крывіна 3, выяўленае і даследаванае ў 1979 і 1980 гадоў Э.М. Зайкоўскім. На жаль, памеры даследавання і атрыманыя матэрыялы не вельмі значныя і не могуць быць выкарыстанымі для культурнага размежавання калекцый суседніх помнікаў [3, 4].

У 2000 годзе Міхал Чарняўскі, падчас абследавання тарфяніковага пажарышча 1999 года, за 1,5 км на паўднёвы-паўднёвы-усход ад в. Асавец Бешанковіцкага раёна Віцебскай вобласці выявіў новае паселішча Асавец 7, матэрыялы якога амаль цалкам адносяцца да паўночнабеларускай культуры з нязначным уключэннем керамікі сярэднедняпроўскай культуры і сярэдняй бронзы (разам менш за 1 % ад агульнай колькасці). З 2000 па 2007 гады на помніку праводзіў раскопкі Максім Чарняўскі [5, 6]. Усяго даследавана 95 кв. м, з іх 25 кв. м зачышчаны на глыбіню тарфянога попелу (0 – 5 см). Паселішча датуецца канцом трэцяй чвэрці 3-га – першай паловай 2 тыс. да н.э. У сваёй цэнтральнай і паўночнай частках яно амаль цалкам знішчана пажарам.

Помнік надзвычай багаты на археалагічны матэрыял. Выяўлена звыш 26 тысяч фрагментаў керамікі, 251 касцяны і рагавы выраб, 7 бурштынавых упрыгожанняў, 190 вырабаў з кары і дрэва, 5 каменных вырабаў, 1 меднае шыла, звыш 17 тысяч фрагментаў костак млекакормячых, птушак і рыб, амаль тысяча лясных арэхаў, чылімаў, жалудоў [2, 6].

Крамянёвы матэрыял на паселішчы (1537 артэфактаў, мал. 1: 2) прадстаўлены адшчэпамі (62 % ад агульнай колькасці), пласцінамі (3 %), сколамі (3 %), лускамі (5 %), а таксама вырабамі (27 %): наканечнікамі стрэл, наканечнікамі дроцікаў, сякерамі, скрэбламі, скрабкамі, скоблямі, нажамі, праколкамі, свердламі, адціскальнікамі, долатамі, рэтушаванымі адшчэпамі і пласцінамі (пададзенае тыпалагічнае вызначэнне прылад першапачатковае і будзе скарэктаванае пасля правядзення трасалагічнага аналізу калекцыі). У вялікай колькасці сустракаюцца камбінаваныя вырабы, пераважна са скрабковай асновай. Колькасна на паселішчы дамінуюць наканечнікі стрэл – 23,2 % ад агульнай колькасці прылад, і вырабы скрабучага

прызначэння (29,2 %), астатнія вызначаныя класы прылад не дасягаюць і 5 % (за выключэннем рэжучых – 8,7 %). На паселішчы візуальна вызначаецца сожскі, валдайскі і нёманскі крэмень. Частка прылад была змайстравана з мясцовага крамяністага мінералу з шурпатай паверхняй сколаў.




Мал. 1. Помнікі паўночнабеларускай культуры (1);
размеркаванне крамянёвых артэфактаў у раскопе на паселішчы Асавец 7 (2)

PolotskSU

Адным з найбольш марфалагічна разнастайных класаў прылад на паселішчы з'яўляюцца **наканечнікі стрэл**. За 8 гадоў даследавання іх выяўлена 98 экземпляраў. Канцэнтрацыя наканечнікаў стрэл у раскопе дасягае 1,3 экземпляра на 1 кв. м.

Наканечнікі стрэл прадстаўлены 5 базавымі формамі-архетыпамі: лістападобным, рамбічным, падрамбічным, трохкутным і фігурным. У межах кожнага з іх на падставе агульных абрысаў вырабаў вылу-

чаюцца групы, якія падзяляюцца на 2 тыпы – чаранковыя (a) і безчаранковыя (b). Асобна стаяць выпадковыя наканечнікі стрэл, абрысы якіх прыстасаваны да канкрэтнага абранага пад выраб адшчэпа. Тым не менш нават у іх з нейкай ступенню верагоднасці можна распазнаць згаданыя архетыпы, а часам і групы.

Для *лістападобнага архетыпу* вылучаюцца 4 групы:

Група 1. Лістападобныя сіметрычныя (мал. 2: 1 – 4,8):

- тып a: чаранковыя (мал. 2: 1, 2);
- тып b: безчаранковыя (мал. 2: 3, 4, 8).

Чаранковыя вырабы прадстаўлены 7 экземплярамі, безчаранковыя – 16 экземплярамі.




Мал. 2. Асавец 7. Наканечнікі стрэл лістападобнага і рамбічнага архетыпаў:
1 – 4, 8 – лістападобныя сіметрычныя; 5, 7 – лістападобныя са змешчаным да вастрыя найбольшым пашырэннем корпуса; 6 – лістападобны кроплепадобны; 9 – 12 – вербалістыя; 13, 15 – 18 – рамбічныя сіметрычныя; 14, 19 – рамбічныя з найбольшым пашырэннем змешчаным да вастрыя

Група 2. Лістападобныя са змешчаным да вастрыя найбольшым пашырэннем корпуса, безчаранковыя (тып b, мал. 2: 5, 7).

Вырабы гэтай групы прадстаўлены 7 экземплярамі.

Група 3. Вербалістыя (мал. 2: 9 – 12):

- тып a: чаранковыя (мал. 2: 11, 12);
- тып b: безчаранковыя (мал. 2: 9, 10).

Адрозненне вырабаў гэтай групы ад лістападобных сіметрычных вызначаецца суадносінамі шырыні і даўжыні наканечнікаў. Апошняя ў вербалістых перавышае шырыню ў 3 і больш разоў, у лістападобных у 2 разы.

Вербалістыя наканечнікі стрэл налічваюць 10 экземпляраў.

Група 4. Кроплепадобныя (найбольшае пашырэнне размешчана ў ніжняй частцы вырабу) безчаранковыя (тып b, мал. 2: 6).

Прадстаўлены 1 экземплярам.

*Рамбічны архетып* складаецца з 3 груп:

Група 1. Рамбічныя сіметрычныя:

- тып a: чаранковыя (мал. 2: 15, 17, 18; 3: 3);
- тып b: безчаранковыя (мал. 2: 13, 16).

Чаранковыя вырабы гэтай групы прадстаўлены 6 экземплярамі; безчаранковыя – 14 экземплярамі.

Група 2. Выцягнутыя рамбічныя, чаранковыя (мал. 3: 1, 2). Прадстаўлены 2 экземплярамі.

Група 3. Рамбічныя асіметрычныя, з найбольшым пашырэннем змешчаным да вастрыя:

- тып a: чаранковыя (мал. 2: 19);
- тып b: безчаранковыя (мал. 2: 14).

Чаранковыя наканечнікі гэтай групы прадстаўлены 1 экземплярам, а безчаранковыя – 3 экземплярамі.

Для *падрамбічнага архетыпу* вылучана адна група падрамбічных сіметрычных шырокіх наканечнікаў з выпуклымі бакавінамі, якая дзеліцца на чаранковыя, тып (a) (мал. 3: 4, 6) і безчаранковыя, тып (b) (мал. 3: 5).

*Трохкутны і фігурны архетыпы* складаюцца кожны з адной групы (мал. 3: 7 – 10; 3: 11 – 14).

З пяці базавых архетыпаў колькасна дамінуюць лістападобны і рамбічны (41 і 26 экземпляраў адпаведна). На групавым узроўні пераважаюць лістападобныя сіметрычныя безчаранковыя і рамбічныя сіметрычныя безчаранковыя вырабы.




Мал. 3. Асавец 7. Наканечнікі стрэл рамбічнага, падрамбічнага, трохкутнага і фігурнага архетыпаў:
1, 2 – выцягнутыя рамбічныя; 3 – рамбічны семітрычны (чаранковы варыянт):
4 – 6 – падрамбічныя; 7 – 10 – фігурныя наканечнікі стрэл

Трэба адзначыць, што наканечнікі стрэл у межах адной групы і нават аднаго тыпу могуць быць па рознаму апрацаванымі, грубай або струменьчатай, плоскай або пільчатай рэтушшу. Яна можа пакрываць усю паверхню вырабу, або размяшчацца толькі па яго перыметры, а часам толькі на вастрыі і насадзе. Рэтуш пераважна двухбаковая, аднак часам з брушка маюцца толькі сляды падрэтушоўкі (мал. 3: 11, 12).

У вырабах гэтага класа абсалютна пераважаюць традыцыйныя для мясцовага неаліту формы. Яны амаль цалкам ідэнтычныя вырабам усвяцкай культуры, якая папярэднічала паўночнабеларускай у Крывінскім рэгіёне. Да запазычанняў з іншых тэрыторый адносяцца выцягнутыя падрамбічныя чаранковыя,

трохкутныя з увагнутай асновай, сіметрычна рамбічныя з завужаным насадам і вастрыём, і вербалістыя з кароткім чаранком наканечнікі стрэл. Іх з'яўленне трэба ўвязваць з традыцыямі культур шнуравой керамікі, якія прасочваліся ў рэгіён з Падняпроўя і Прыбалтыкі. Фігурныя наканечнікі стрэл хутчэй за ўсё маюць мясцовае паходжанне, зыходзячы з кампактнага распаўсюджання дакладных аналогій і малой колькасці саміх артэфактаў. Цікава, што некаторыя крамянёвыя наканечнікі капіруюць формы адной з найбольш шматлікіх груп касцяных наканечнікаў стрэл [2, мал. 6: 9, 10, 8: 10].

**Наканечнікаў дзід** у цэлым выглядзе выяўлена не было. Адзін артэфакт можа быць папярэдне ідэнтыфікаваны як нарыхтоўка такой прылады (мал. 4: 1), шэраг дробных фрагментаў таксама можа быць аднесены да гэтага класа. **Наканечнікі дроцікаў** уяўляюць сабой памяншаныя копіі лістападобных сіметрычных чаранковых наканечнікаў стрэл (мал. 4: 2). Прадстаўлены адным цэлым і трыма пашкоджаным экземплярамі. Цэлых крамянёвых **сякер** на паселішчы выяўлена не было. Адзіны завершаны выраб з'яўляецца перапрацоўкай большай прылады і ўяўляе сабой невялікую сякерку з набліжаным да лінзападобнага папярэчным сячэннем і прытупленым абушком. Корпус пасярэдзіне выразна звужаны. Шліфоўка пакрывае значную частку корпуса і дасягае абушка. Лязо прышліфаванае асобна і больш акуратна (мал. 4: 3).

Акрамя апісанага вышэй вырабу, вядома яшчэ 5 фрагментаў гэтага класа. Першапачатковая колькасць крамянёвых шліфаваных сякер на помніку была значна большай. Пра гэта сведчаць разнастайныя дробныя прылады, а таксама адшчэпы і пласцінкі, паверхня якіх утрымлівае ўчасткі з прышліфоўкай (мал. 4: 4, 5). Усе яны з'яўляюцца сведчаннем другаснага выкарыстання пашкоджаных сякер, што было выклікана недахопам крэмню ў рэгіёне. Колькасць падобных артэфактаў на паселішчы дасягае 10 экземпляраў. Яшчэ адным сведчаннем аб больш шырокім выкарыстанні шліфаваных сякер на паселішчы з'яўляюцца шматпляцовачныя шліфавальныя пліты, якія былі выяўлены ў 2 асобніках (мал. 4: 6).




Мал. 4. Асавец 7, крамянёвыя і каменныя вырабы:
1 – нарыхтоўка наканечніка дзіды; 2 – наканечнік дроціка; 3 – мініяцюрная сякера;
4, 5 – вырабы з участкамі зашліфаванасці на паверхні; 6 – шліфавальная пліта

**Долаты** прадстаўлены вырабамі двух тыпаў. Першы з іх уяўляе сабой дробны вузкі выраб з пры-шліфаваным з двух бакоў лязом (мал. 5: 1), другі аформлены на масіўнай высокай прызмападобнай у сячэнні пласцінцы, бакавіны якой апрацаваны крутой рэтушшу, а вастрыё – больш плоскай (мал. 5: 2). Рэтуш па бакавінах з моцнымі заломамі, верагодна, яны выкарыстоўваліся як скрабніцы. Абедзве прылады выяўлены ў адным экземпляры.

Крамянёвыя **прылады колюча-свідруючага** прызначэння (праколкі, пракруткі і свердлы – 10 артэфактаў), прадстаўлены трыма групамі:

- група 1. З кароткай вызначанай працоўнай часткай, аформленай супрацьлеглай, радзей двухбаковай па адной з бакавін, рэтушшу. Вылучаюцца два тыпы – з вострым завяршэннем і «стажковым» завяршэннем (мал. 5: 4, 5, 7, 9). Частка прылад мае дадатковае функцыянальнае прызначэнне, рэжучае або скоблячае;
- група 2. З сіметрычнымі завостранымі працоўнымі часткамі, якія апрацаваныя з абедзвюх паверхняў акуратнай падвастраючай рэтушшу. Апошняя не змяшчае візуальных слядоў прытупленасці або заполіраванасці ад выкарыстання (мал. 5: 6, 8);
- група 3. З закругленымі шырокімі працоўнымі часткамі, апрацаванымі па перыметры дробнай рэтушшу (мал. 5: 3). Апошняя моцна спрацавана, візуальна адсочваецца яе моцная прышліфаванасць па бакавінах. Частка прылад мае дадатковае функцыянальнае прызначэнне, пераважна рэжучае.



Мал. 5. Асавец 7:
1, 2 – долаты; 3 – 9 – прылады колюча-свідруючага прызначэння:
3 – група 3; 4, 5, 7, 9 – група 1; 6, 8 – група 2

Крамянёвыя **прылады скрабучага прызначэння** складаюць самую вялікую катэгорыю прылад, колькасны падлік якой ускладнены дастаткова шматлікай групай камбінаваных вырабаў. Папярэдне да класа аднесены 123 артэфакты, з улікам камбінаваных вырабаў іх колькасць складзе 148 экземпляраў). Сярод іх можна вылучыць наступныя групы:

- група 1. Падквадратныя. Вылучаюцца тры тыпы – тарцовыя, тарцовыя аднабаковыя і тарцовыя двухбаковыя вырабы (мал. 6: 4);

- група 2. Мініяцюрныя, з невысокай скрабніцай, размешчанай на тарцы і абедзвюх бакавінах (мал. 6: 13);
- група 3. Выцягнутыя падпрамакутныя вырабы з адной тарцовай скрабніцай (мал. 6: 12). У адным выпадку яна высокая і стромкая, у другім – невысокая, аформленая дробнай рэтушшу;
- група 4. Трапецыяпадобныя вырабы з вузкай падставай, некаторыя вырабы набліжаюцца да падтрохкутных. Вылучаюцца тры тыпы – тарцовыя, тарцовыя аднабаковыя і тарцовыя двухбаковыя вырабы (мал. 6: 1 – 3, 6, 11);
- група 5. Выцягнутыя вырабы, аформленыя пераважна на высокіх пласцінках. Змяшчаюць тарцовую і адну бакавую скрабніцы, на другім баку маецца ад адной да 3 скоблячых выемак (мал. 6: 9, 10);
- група 6. Вырабы «мысавога» тыпу (мал. 6: 14, 15). У двух выпадках падстава таксама змяшчае скрабніцу, што набліжае гэтыя вырабы да трапецыяпадобных з тарцавой двухбаковай скрабніцай;
- група 7. Дробныя вырабы падквадратнай або трапецыяпадобнай формы са скрабніцай па перыметры (мал. 6: 7, 8);
- група 8. Вырабы са скрабніцай на паўкруглай бакавіне. Вылучаюцца два тыпы: 1) стромкая рэтуш ідзе па ўсёй бакавіне (мал. 6: 16), 2) рэтушаваная толькі палова бакавіны. У адным выпадку на супрацьлеглай бакавіне маецца яшчэ адзін невялікі ўчастак скрабніцы.



Мал. 6. Асавец 7. Вырабы скарубчага прызначэння:
1 – 3, 5, 6, 11 – група 4; 4 – група 1; 7, 8 – група 7; 9, 10 – група 5; 12 – група 3; 14, 15 – група 6;
16 – група 8; 19 – група 9; 17, 18, 20 – атыповыя вырабы; 13 – група 2

Асобна трэба адзначыць шэраг скрабкоў розных груп, якія аб'ядноўвае адна дэталь, а менавіта кароткі (стажковы) выступ у адным з кутоў тарцовай скрабніцы (пераважна правым – мал. 6: 18). Толькі ў

адным выпадку ён размешчаны крыху бліжэй да сярэдзіны. Выступ аформлены маленькімі скаблоіднымі выемкамі. Ва ўсіх выпадках скрабніца як выемак, так і стажковага выступу нясе сляды моцнай спрацаванасці.

Падобнае прызначэнне можа мець і наступная група (9) невялікіх па памерах вырабаў, у якіх скрабучыя або скоблячыя бакавіны сыходзяцца ва ўмоўнае вастрыё (мал. 6: 19);

- група 10. Вырабы на высокіх, злёгку выгнутых пласцінках трохкутнага сячэння, на бакавінах якіх аформлены скрабучыя і скоблячыя скрабніцы (мал. 7: 4, 8);

- група 11. Масіўныя скрэблы на сколах з высокімі бакавымі скрабніцамі.

Колькасна пераважаюць трапецыяпадобныя вырабы (група 4), на наступным месцы прылады 5 і 8 групаў.

**Скоблячыя вырабы**, колькасцю 18 экземпляраў, прадстаўлены наступнымі групамі:

- група 1. Падтрохкутныя вырабы з адной ці двума скоблячымі выемкамі на большай бакавіне (мал. 7: 5). У адным выпадку адна з меншых бакавін таксама ўтрымлівае скоблячую выемку;

- група 2. Вырабы на пласцінах і пласцінчатых адшчэпах. Вылучаецца некалькі тыпаў: аднабаковыя з адной або некалькімі скоблячымі выемкамі і двухбаковыя вырабы, з адной або некалькімі скоблячымі выемкамі з кожнага боку (мал. 7: 7);

- група 3. Вырабы на адшчэпах выпадковай формы з адной або дзвюма скоблячымі выемкамі (мал. 7: 6);

Скоблячыя вырабы папярэдне можна падзяліць таксама паводле апрацоўкі скрабніцы і накірунку руху падчас працы – стромкія скрабніцы для скаблення ў кірунку на сябе і больш плоскія скрабніцы для працы ад сябе, больш габлюючага дзеяння.



Мал. 7. Асавец 7. Крамянёвыя вырабы скаблоіднага (5 – 7), скрабучага (4, 8), рэжучага (9 – 13, 15) і нявызначанага значэння (1 – 3, 14). Скаблоідныя: 5 – група 1; 6 – група 3; 7 – група 2. Скрабучыя: 4, 8 – група 10. Рэжучыя: 9, 10 – група 2; 11 – група 4; 12 – група 1; 13 – група 6; 15 – група 3

Сярод 37 экземпляраў **прылад рэжучага прызначэння** можна вылучыць 6 груп:

- група 1. Востраканечнікі на адшчэпах з двума лёзамі, якія зыходзяцца на вастрыё. Рэтуш плоская, падвастраючая (мал. 7: 12). У трох выпадках адна з бакавін мае дадатковую падрэтушоўку з брушка;

- група 2. Вырабы на адшчэпах з рэтушаванай адной бакавінай або найбольш выступаючым участкам на ёй. Прымыкаючая да яе пад адносна вострым кутом другая бакавіна або прытуплена стромкай рэтушшу, або мае натуральную тупую паверхню (мал. 7: 9, 10);

- група 3. Падпрамакутны, крыху скошаны ў плане, выраб апрацаваны па перыметру месцамі падвастраючай, месцамі прытупліваючай рэтушшу (мал. 7: 15);

- група 4. Серпападобны выгнуты нож на масіўным адшчэпе, апрацаваны адносна стромкай рэтушшу з абедзвюх бакавін, якія сыходзяцца на вастрыё (мал. 7: 11).

- група 5. Масіўныя пласцінчатыя адшчэпы з падвастраючай рэтушшу на адной з бакавін.

- група 6. Пласцінкі, зломы пласцінак і пласцінчатыя адшчэпы з падвастраючай рэтушшу (мал. 7: 13).

**Разцы** на помніку прадстаўлены 2 прыладамі. Адна з іх мае 2 разцовыя сколы, размешчаныя на супрацьлеглых бакавінах, на другой разцовыя сколы сыходзяцца на адну вяршыню.

Такое мізэрнае прадстаўніцтва разцоў на помніку з вялікай колькасцю касцяных і рагавых вырабаў дазваляе меркаваць, што для апрацоўкі косткі носьбіты паўночнабеларускай культуры выкарыстоўвалі і іншыя прылады, найперш скрабучага і рэжучага прызначэння.

**Рэтушор – адбойнік** на абломку шліфаванай сякеры з трыма працоўнымі паверхнямі. Дзве з іх размешчаны на калялёзавым зломе і выкарыстоўваліся выключна для рэтушавання прылад, трэцяя знаходзіцца на самым завяршэнні абушка і прызначалася як для рэтушавання, так і для адбіцця адшчэпаў або пласцін. Выяўлены ў 1 экземпляры.

Асобна трэба адзначыць **прылады невядомага прызначэння:**

1) вырабы на зломах пласцінак і на пласцінчатых адшчэпах, апрацаваных па бакавінах. З аднаго боку рэтуш стромкая, прытупліваючая, з другога больш плоская, завостраваючая (гл. мал. 6: 20). Верагодна, маглі выкарыстоўвацца як камбінаваныя скаблільна-рэзальныя прылады. Выяўлены ў 7 экземплярах;

2) вырабы на выгнутых пласцінках і адшчэпах з адной рэтушаванай плоскай падвастраючай рэтушшу бакавінай. У выніку працоўнае лязо мае крыху выгнутую лінію (гл. мал. 7: 14). Як нож такія прылады выкарыстоўваць цяжка праз выгнутасць ляза, яно не зможа рэзаць па прамой лініі. Аднак калі прыціснуць лязо пад кутом, набліжаным да 90 градусаў, то атрымліваецца добры скрабучы інструмент. Усяго іх выяўлена 5 экземпляраў;

3) востраканечнікі на доўгіх пласцінках, апрацаваныя па перыметры дастаткова стромкай рэтушшу (мал. 7: 14). Асноўнае прызначэнне нявызначана. Рэтуш на бакавінах нясе візуальныя прыкметы спрацаванасці. Адзін з вырабаў мае сустрэчную падрэтушоўку вастрыя з брушка і мог дадаткова выкарыстоўвацца як пракрутка/праколка. Вастрыё другой прылады падпраўлена з брушка разцовым сколам. У трэцяй прылады апрацаваны базальны канец, на якім аформлена косая скрабніца. На сённяшні дзень падобных вырабаў вядома 7 экземпляраў;

4) дробныя вырабы на адшчэпах і зломах пласцінак з вельмі малымі ўчасткамі рэтушы на бакавінах, прамымі або, пераважна, увагнутымі (мал. 7: 1 – 3). Усяго выяўлена 13 экземпляраў.

Акрамя вышэйпералічаных прыладаў, вядома 37 невызначальных фрагментаў крамянёвых вырабаў, амаль палова з якіх пашкоджана агнём.

Такім чынам, ужо на першым этапе аналізу крамянёвай калекцыі паселішча паўночнабеларускай культуры Асавец 7 можна адзначыць наступныя асбалівасці:

- высокі працэнт артэфактаў з другаснай апрацоўкай, у параўнанні з адначасовымі матэрыяламі Падняпроўя, Пасожжа і Панямоння (29 % на паселішчы Асавец 7) [7, с. 98 – 99];
- перавага вырабаў на адшчэпах;
- вялікая разнастайнасць формаў прылад аднаго функцыянальнага прызначэння;
- камбінаванасць прылад – на адной прыладзе аформлены скрабок і скобля, або нож і разец, або скрабок і пракрутка і г.д.;
- паўторнае выкарыстанне пашкоджаных прылад, найперш вялікіх памераў – сякер, наканечнікаў дзід і г.д.;
- колькасная перавага ў калекцыі вырабаў скрабуча-скоблячага прызначэння;
- вялікая колькасць наканечнікаў стрэл;
- мінімальная колькасць разцоў для культуры з багатай касцярэзнай традыцыяй;
- амаль поўная адсутнасць нуклеусаў (спрацаванасць да мінімальных памераў).

У якасці асноўнай рысы крамянёвага матэрыялу паселішча можна адзначыць перавагу прыладаў, выробленых у традыцыях лясного неаліту (наканечнікі стрэл, скрабкі, скоблі і г.д.).

ЛІТАРАТУРА

1. Чарняўскі, М.М. Паўночнабеларуская культура / М.М. Чарняўскі // Археалогія Беларусі: у 4 т. – Мінск: Беларус. навука, 1997. – Т. 1: Каменны і бронзавы вякі. – С. 311 – 329.

PolotskSU

2. Чарняўскі, Макс.М. Касцяныя і рагавыя вырабы на паселішчах Крывінскага тарфяніку (неаліт – бронзавы век) / Макс. М. Чарняўскі. – Мінск: Беларус. навука, 2007. – 152 с.
3. Зайкоўскі, Э.М. Паселішча на Крывінскім тарфяніку / Э.М. Зайкоўскі // Помнікі гісторыі і культуры Беларусі. – 1980. – № 1. – С. 29.
4. Зайкоўскі Э.М. Новае паселішча паўночнабеларускай культуры / Э.М. Зайкоўскі // Весці АН БССР. Сер. грамадз. навук. – 1982. – № 5. – С. 82 – 88.
5. Чарняўскі, Макс.М. Першыя вынікі даследавання тарфяніковай стаянкі Асавец 7 / Макс.М. Чарняўскі // Матэрыялы па археалогіі Беларусі. – 2003. – № 6. – С. 70 – 84;
6. Чернявский, Макс.М. Асавец 7 – новое поселение Кривинского торфяника / Макс.М. Чарняўскі // Человек. Адоптация. Культура. – М., 2008. – С. 374 – 388.
7. Калечиц, Е.Г. Памятники каменного и бронзового веков восточной Белоруссии / Е.Г. Калечиц. – Минск: Наука и техника, 1987. – 158 с.

## КЕРАМІКА УСВЯЦКАЙ КУЛЬТУРЫ: НАБЫТКІ АПОШНІХ ПАЛЯВЫХ СЕЗОНАЎ

*канд. гіст. навук, дац. Міх.М. ЧАРНЯЎСКІ*
*(Беларускі дзяржаўны універсітэт, Мінск)*

*Неалітычная эпоха на поўначы Беларусі прадстаўлена трыма асноўнымі археалагічнымі культурамі – нарвенскай (ранні неаліт), усвяцкай (сярэдні неаліт) і ранняй фазай паўночнабеларускай (позні неаліт). Амаль 2000 фрагментаў керамікі ўсвяцкай культуры, атрыманых у 2002 – 2007 гады на паселішчы Асавец 2 Бешанковіцкага р-на, паходзяць пераважна ад гаршчкоў. Гэта былі вастрадонныя пасудзіны шлемападобнай або паўсферычнай формы з гладкімі сценкамі з дабаўкамі тоўчаных ракавін, арнаментаванымі пераважна насечкамі. У аздабленні керамікі прысутнічаюць стылізаваныя выяўленчыя матывы, якія адлюстроўваюць вераванні тагачаснага чалавека – качкі, змеі, яйкі, знакі воднай стыхіі.*

Неалітычная эпоха на поўначы Беларусі прадстаўлена трыма асноўнымі археалагічнымі культурамі – нарвенскай (ранні неаліт, 4-е тыс. да н.э.), усвяцкай (сярэдні неаліт, першая палова III тыс. да н.э.) і паўночнабеларускай (позні неаліт, ад сярэдзіны 3-га тыс. да н.э.), якая працягвала сваё існаванне ў бронзавым веку. І кожная з іх вылучаецца найперш адметнасцю і непаўторнасцю керамічных комплексаў – тэхналогіяй вырабу, формамі посуду, стылямі яго арнаментацыі. У гэтым сэнсе выдатнае месца займае кераміка ўсвяцкай культуры, калекцыя якой істотна папоўнілася раскопкамі апошніх гадоў (2002 – 2007) на стаянцы Асавец 2 каля аднаназоўнай вёскі Бешанковіцкага р-на (мал. 2). Гэты помнік увыходзіць у комплекс паселішчаў неаліту – бронзавага веку Крывінскага тарфяніка на мяжы Бешанковіччыны і Сенненшчыны [1].




Мал. 1. Тарфяніковая стаянка Асавец 2:
1 – асноўны раскоп; 2 – раскоп 2002 – 2007 гг.;
3 – выяўленая канцэнтрацыя матэрыялаў усвяцкай культуры; 4 – межы помніка

Археалагічныя помнікі, перакрытыя торфам, захоўваюць мноства артэфактаў, асабліва арганічных, якія залягаюць у непарушанай тысячагоддзямі стратыграфіі. Гэта вымагае няспешнай і вельмі акуратнай разборкі культурнага пласта на малых плошчах, у якой выключаецца прымяненне рыдлёвак. Так, за